# Удзячнасць за грамадскую работу



*Агульны здымак на памяць*

**Падведзены вынікі дзейнасці добраахвотных дружын на тэрыторыі раёна за 2018 год.**

У мінулым годзе членамі добраахвотных дружын сумесна з супрацоўнікамі міліцыі спынена 58 адміністрацыйных правапарушэнняў. Дружыннікі выходзілі на дзяжурствы ў выхадныя дні, а таксама падчас масавых святаў і гулянняў. Летась адказным экзаменам для іх стаў удзел у забеспячэнні правапарадку падчас святкавання 425-годдзя Стоўбцаў. Найбольшай актыўнасцю вызначыліся добраахвотныя дружыны Стаўбцоўскіх электрасетак, ПМК-233 і філіяла ААТ «ККХ «Мінскі маторны завод» у г. Стоўбцы», камандзіры і члены якіх і былі адзначаны падзячнымі лістамі і падзякай старшыні райвыканкама. Немалаважна, што сярод адзначаных дружыннікаў ёсць і

дружынніцы.

Гэтым заахвочваннем акрэслена роля дружыннікаў у забеспячэнні правапарадку, прававой асвеце, а таксама адрасаваны пасыл іншым прадпрыемствам і арганізацыям раёна: неабходна імкнуцца за тымі, хто паспявае і ў вытворчых справах, і ў грамадскіх.

— Дзякуй за вашу грамадскую работу і грамадзянскую пазіцыю, — зазначыла падчас уручэння падзячных пісьмаў намеснік старшыні райвыканкама Жанна Лысая. — Наперадзе нас чакаюць 3 ліпеня і іншыя значныя святы і мерапрыемствы, таму ваша дапамога патрэбная. Просьба — прыцягваць у рады дружыннікаў больш моладзі, — заклікала Жанна Мікалаеўна.

У пытаннях правапарадку і грамадскай бяспекі актуальнае патрабаванне да кожнага з нас — не быць абыякавымі. Думаецца, не лішне спытаць у сябе: «А чым я дапамог? Якая мая роля?»

— У сучасны момант дзейнічаюць сем добраахвотных дружын у райцэнтры і 11 — у сельскай мясцовасці. У іх радах — 112 грамадзян. Акрамя таго, 20 грамадзян з'явілі жаданне быць членамі добраахвотнай дружыны пры аддзеле ДАІ, — зазначае начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі райаддзела міліцыі Юлія Белавусава. — Для эфектыўнай работы дружын з іх камандзірамі праводзім семінары.

**Таццяна ПЯТКЕВІЧ, фота аўтара**